*Іна Алексніна*

**ДА ПЫТАННЯ ВЫВУЧЭННЯ І ЗАХАВАННЯ ТЭАТРАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я**

*У артыкуле раскрываюцца асноўныя напрамкі, праблемы і перспектывы вывучэння і захавання тэатральнай культурнай спадчыны жыхароў Заходняга Паазер'я ў другой палове XX – першай палове XXI стагоддзя.*

*Ina Alexnina*

**TO THE ISSUE OF STUDY AND PRESERVATION OF THE THEATRICAL CULTURE OF BELARUSIANS IN THE WESTERN LAKE DISTRICT**

*The article reveals the main directions, problems and perspectives for the study and preservation of the theatrical cultural heritage of the inhabitants of the Western lake district in the 2nd half of the 20th – 1st half of 21th century.*

Сёння, у пачатку XXI стагоддзя, наша тэатральнае мастацтва перажывае новы віток свайго развіцця. У пошуках сучасных форм існавання, ва ўмовах татальнай глабалізацыі мастацтва, мы усё часцей звяртаемся да праблемы вывучэння і захавання, а таксама сучаснага пераасэнсавання здабыткаў і дасягненняў народнай творчасці жыхароў нашай краіны. Таму вельмі актуальнымі і ў пачатку XXI стагоддзя застаюцца праблемы вывучэння і захавання тэатральнай спадчыны народа ў тых мясцінах Беларусі, дзе і сёння няма не толькі прафесійных тэатральных устаноў. Адным з такіх рэгіёнаў сучаснай Беларусі застаецца заходняя частка Беларускага Паазер'я.

Рэгіянальнае вывучэнне мастацтва Беларусі пачалося толькі ў 1990-я гады, калі, зыходзячы з падабенства этнаграфічных, гістарычных, палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных прыкмет, на тэрыторыі Беларусі было вылучана шэсць этнаграфічна-культурных рэгіёнаў: Паазер'е (Падзвінне), Панямонне, Падняпроў'е, Цэнтральная Беларусь, Усходняе і Заходняе Палессе. Больш паглыбленыя даследаванні этнографаў і этнолагаў даказалі, што Беларускае Паазер'е складаецца з трох "лакальных раёнаў" – усходняга, цэнтральнага і заходняга.

Цікавасць да вывучэння спадчыны тэатральнай культуры менавіта Заходняга Паазер'я (сучасныя Докшыцкі, Пастаўскі, Глыбоцкі, Шаркоўшчынскі, Браслаўскі і Міёрскі) прадыктавана тым фактам, што сфарміравалася яна ва ўмовах адсутнасці значных па эканоміка-культурным уздзеянні гарадоў, на памежжы з Латвіяй і Літвой, пад уплывам пераважна аграрнага роду заняткаў і местачкова-хутарскога ладу жыцця. Тэатральная культура жыхароў гэтай часткі Беларусі пазначана адбіткам рэлігійных светапоглядаў творцаў з народа, супрацьстаяннем польскай і беларускай культур у 1920 – 1930-я гг. І сёння тэатральныя жанры тут функцыянуюць на стыку паратэатральных формаў народнай творчасці і аматарскага мастацтва.

Увагу даследчыкаў прыцягвала пераважна песенная і харэаграфічная спадчына. Да тэатральна-гульнёвых формаў фальклору рэгіёна ў розныя часы звярталіся А. Драеўскі [4], Д. Зяленін [7], А. Сапуноў-Друцкі [9, 11], В. Камінскі [8], Я. Драздовіч [5, 6], А. Чэрны [13], Л. Цыбульскі [12]; супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору З. Мажэйка, Л. Мухарынская і І. Назіна; Беларускага інстытута праблем культуры Т. Варфаламеева, В. Басько і А. Боганева; Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Л. Каралькова, рэгіянальнага культурна-асветніцкага цэнтра імя Я. Драздовіча А. Райчонак і інш.

Заходняе Паазер'е мае багаты матэрыял для тэатразнаўчых даследаванняў і таму, што ва ўмовах своеасаблівай ізаляванасці ад цывілізацыі тут нарадзіліся і захаваліся да другой паловы XX ст. цікавейшыя тыпы святкаванняў карнавальнага тыпу (калядаванне "трох каралёў", лалоўніцтва, ігрышчы "Яшчар", "Жаніцьба Цярэшкі", персанажы калядных прадстаўленняў, узоры спалучэння жыцця, абраду і тэатра), сфарміраваліся ўнікальныя мастацкія традыцыі ў народнай драматычнай творчасці, што прывяло да стварэння батлейкавага тэатра Патупчыка і Першай беларускай трупы І.Ц. Буйніцкага.

Менавіта з заходняй часткай Беларускага Паазер'я звязана жыццё і творчасцю такіх выбітных дзеячаў нацыянальнай культуры і мастацтваў, як дынастыя Тызенгаўзаў, Патупчык, І.Ц. Буйніцкі, Ф.К. Аляхновіч, П. Мядзёлка-Грыб, А. Пашкевіч, М. Пецюкевіч, Я. Драздовіч, С. Грынкевіч, П. Сергіевіч, К. Езавітаў, А. Цікота, Я. Германовіч і інш., што дазваляе нам называць Заходняе Паазер'е "калыскай беларускамоўнага прафесійнага мастацтва", дае падставу гаварыць аб каштоўнасці яго тэатральнай спадчыны і актуалізуе праблему яе вывучэння. Асабліва важна гэта і таму, што сапраўдных носьбітаў і знаўцаў тэатральнай спадчыны і не толькі ў Заходнім Паазер'і, але і па ўсёй тэрыторыі Беларусі застаюцца лічаныя адзінкі.

У беларускім тэатразнаўстве адлюстраваны толькі асобныя з'явы тэатральнай творчасці рэгіёна (працы Г.І. Барышава [2], У.І. Няфёда [3], С.А. Пятровіча [10]). Паратэатральныя формы народнай творчасці Заходняга Паазер'я, пазначаныя самабытнасцю і разнастайнасцю, цесна звязаныя са святочна-абрадавай і пазаабрадавай традыцыяй, у мастацтвазнаўстве не вывучаліся. Мала даследаванай з'яўляецца і тэатральная спадчына гэтай часткі Беларусі. Адзіным на сённяшні дзень навуковым даследаваннем застаецца даследаванне аўтара гэтага артыкула па тэме "Тэатральная культура беларусаў Заходняга Паазер'я: спадчына і сучаснасць" [1].

Даследчыкамі тэатральнага мастацтва Беларусі практычна заўсёды прымяняўся сінхранічны падыход (ад грэч. synchronos – адначасовы). Структура тэатральнай творчасці або некаторыя яе з'явы вывучаліся ў пэўны перыяд часу і незалежна ад тэрытарыяльнай часткі Беларусі. Аднак сёння наспела неабходнасць даследавання тэатральнага мастацтва шляхам спалучэння прынцыпаў сінхраніі і дыяхраніі (ад грэч. dia – праз, скрозь, chronos – час). Гэта дазваляе нам вывучыць паслядоўнасць этапаў станаўлення і развіцця тэатра, гістарычныя ўзаемаадносіны і сувязі тыпаў і форм гэтага віду творчасці.

У аснове дыяхранічнага падыходу ляжыць аналіз дынамікі станаўлення і развіцця сістэмы тэатральнай культуры (у дадзеным выпадку аднаго беларускага рэгіёна) на розных яе ўзроўнях. Сінтэз сінхраніі і дыяхраніі аўтар артыкула называе сістэмным падыходам. Акрамя сістэмнага падыходу да вывучэння рэгіянальных тэатральных культур на тэрыторыі сучаснай Беларусі, дастаткова перспектыўным падаецца і выкарыстанне параўнальнага аналізу рэгіянальных тэатральных культур. Напрыклад, спадчыны тэатральнай культуры Заходняга Палесся і Заходняга Паазер'я.

У пачатку XXI стагоддзя асабліва значнымі падаюцца не толькі праблемы вывучэння, але і праблемы захавання тэатральнай спадчыны аднаго гісторыка-культурнага рэгіёна Беларусі. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што працэс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэння дасягненняў народнага мастацтва (у тым ліку, і тэатрлаьнага), якi пачаўся ў 1990-я гг. XX стагоддзя, сёння спынены.

Менавіта на сучасным этапе, у перыяд рэфармацыі не толькі прафесійнага, але і аматарскага мастацтва, ва ўмовах аднаўлення цікавасці да шматгадовых культурных традыцый нашага народа, пераарыентацыі аматарскай творчасці на выкананне выхаваўча-эстэтычнай, камунікатыўнай, духоўнай і мастацкай функцый, што магчыма толькі ва ўмовах поўнага адмаўлення ад далейшага капіравання масава-эстрадных форм прафесійнага мастацтва, ва ўмовах, калі мастацкая творчасць народа стане дзейсным сродкам аднаўлення і памнажэння здабыткаў нацыянальнага тэатральнага мастацтва.

**Спіс літаратуры:**


1. Алексніна, І. А. Тэатральная культура беларусаў Заходняга Паазер'я: спадчына і сучаснасць: дыс… канд. мастацтвазнаўства : 17.00.01 – тэатральнае мастацтва. – Мінск : НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, 2000. – 138 с.
2. Барышев, Г. И. Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Минск : Наука и техника, 1992. – 293 с.
3. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / гал. рэд. У. І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 года. – 496 с.
4. Драевский, А. Л. Белорусы Дисненского уезда / А. Л. Драевский. – Вильно, 1907. – 213 с.
5. Драздовіч, Я. Рукапісны сборнік беларускіх народных песень, 1930 / Я. Драздовіч. Рукапіс. – Бібліятэка НАН Беларусі, чыт. зала рукапісаў і рэдкай кнігі, 163 кадры.
6. Драздовіч, Я. Рукапісы этнаграфічных матэрыялаў Дзісненшчыны. Піншчына. –1930 / Я. Драздовіч. Рукапіс. – Бібліятэка НАН Беларусі, чыт. зала рукапісу і рэдкай кнігі, 510 кадраў.
7. Зеленин, Д. К. Описание рукописей ученого архива императорского русского географического общества / Д. К. Зеленин. – СПб., 1914. – С. 108–127.
8. Камінскі, В. Беларусы Дзісненскага павета Ковенскай губерніі ў іх песнях, абрадах, звычаях / В. Камінскі. – Вільня, 1889. – 114 с.
9. Материалы по истории и географии Дисненского и Витебского уездов Виленской губернии / ред. А. Сапунов-Друцкий. – Витебск : Б. и., 1896. – 277 с.
10. Пятровіч, С. А. Тэатральная самадзейнасць Савецкай Беларусі / С. А. Пятровіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 287 с.
11. Сапунов, А. Витебская старина / А. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1. – 609 с.
12. Цибульский, Л. О. Опыт исследования одной волости (Поставской), по образцу которой предполагается описать Виленскую губернию / Л. О. Цибульский. – Вильно, 1902 – 164 с.
13. Czerny, A. Piesni bieloruskie z powiatu Dzisninskiego gubernii Wilenskiej / A. Czerny // Zbor Wiadomosci do Antropologii Krajowej. – Krakow, 1895. – T. 18. – S. 192–224.



***Наталья Шелупенко***


## СЕМЕЙНЫЕ ТРАДИЦИИ БЕЛОРУСОВ КАК ФОРМА ПРЕЕМСТВЕННОСТИ ПОКОЛЕНИЙ


*В статье рассматриваются основные семейные традиции белорусов, их значение в социализации и воспитании детей, раскрывается роль семейных традиций в межпоколенной трансляции духовной культуры белорусского народа.*



***Natalia Shelupenko***


## BELARUSIAN FAMILY TRADITIONS AS A FORM OF GENERATIONS CONTINUITY


*The main family traditions of Belarusians, their importance in socialization and education of children are considered in the article, the role of family traditions in the intergenerational transmission of the spiritual culture of the Belarusian people is revealed.*


Семейные традиции являются важной частью духовной культуры белорусского народа, своеобразным механизмом трансляции от поколения к поколению культурных норм и ценностей, стереотипов поведения, морально-этических принципов. Становление и развитие семейных традиций белорусов обусловлено закономерностями социально-исторического развития и этническими традициями белорусского народа.

Семейные традиции белорусов формировались на протяжении веков, объединяли семью, способствовали воспитанию и социализации детей, передавали от старших к младшим нормы поведения и трудовые навыки, укрепляли внешние связи семьи с соседями, родственниками, друзьями. Основу семейных традиций белорусского народа составляли такие нравственные ценности, как забота о родных и уважение к ним, взаимовыручка, трудолюбие, доброжелательность, патриотизм, честность, скромность, гостеприимство.

Важнейшая роль в семье отводилась совместному труду. Трудиться в белорусской семье обязаны были все, в том числе и дети. Приучение к труду происходило постепенно, начиная с четырёх-пяти лет. Напряженность труда регулировалась родителями в соответствии с полом и возрастом ребенка. Так, дети с семи лет ухаживали за домашними животными, собирали в лесу грибы и ягоды, носили обеды тем, кто работал в поле, нянчили младших детей. Девочки учились прясть, шить и готовить еду, мальчики – работать в поле: пахать землю, косить, бороновать. В шестнадцать лет дети выполняли всю домашнюю работу и, в случае необходимости, могли полностью заменить взрослых.

Особенно значимым был совместный труд детей и родителей, пример трудолюбия и уважения к труду родителей, рождавшие коллективизм, солидарность. Например, дети, пройдя весь путь посадки, вырастив и собрав урожай, видели результат своего труда, понимали свой вклад в жизнеобеспечение семьи [2, с. 396].

Воспитание детей в труде и трудом способствовало формированию трудолюбия и навыков ведения хозяйства. В процессе совместной трудовой деятельности, включаясь в сложившуюся систему общественных взаимоотношений,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ